Слаўся, Айчына ты наша свабодная!

Голас Радзімы

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАЙ СЕКЦЫІ КАМІТЭТА ЗА ВЯРТАННЕ НА РАДЗІМУ І РАЗВІЦЦЕ КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЕЙ З СУАЙЧЫННІКАМІ

№ 78 (563) | Кастрычнік 1961 г. | Год выдання 7-ы

На ўскраіне Віцебска





Керамзітавы завод. Гэта новае прадпрыемства на адной з ускраін Віцебска. Тут будзе выпрацоўвацца з тліны керамзіт для запаўнення жалезабетонных вырабаў. Новы будаўнічы матэрыял у пяць разоў лягчэй за гравій, плавае ў вадзе. Працэс прыгатавання яго поўнасцю механізуецца. **НА ЗДЫМКАХ:** 1. Агульны выгляд керамзітавата завода. 2. Вярчальная печ для абпальвання керамзіту.

Аўтатурысцкі лагер

Не так даўно на аўтамагістралях краіны выраслі новыя ўстановы адпачынку — кемпінгі.

Добры кемпінг пабудаваны і працуе непадалёку ад Мінска, на вядомай аўтамагістралі Брэст — Масква. Участак лагера размешчан у лесе, добра распланаван і добраўпарадкаван. Турысты забяспечваюцца тут пасцельнымі прыладамі, ежай, палаткамі. На тэрыторыі кемпінга ёсць пошта, абменны пункт Дзяржбанка, прадуктовы магазін, пракат спартыўнага і гаспадарчага інвентару, буфет... Да паслуг жадаючых — кухня, дзе на газавай плітцы можна самому згатаваць снеданне ці вячэру.

Сярод зелені разбіты валейбольныя і баскетбольныя пляцоўкі. Пры кемпінгу ёсць заправачная калонка, тут жа можна памыць аўтамашыну.

Лагер у гэтым годзе працаваў з мая па кастрычнік. Некаторыя турысты не толькі спыняліся ў ім праездам, але і жылі па два-тры тыдні. Кемпінг за гэты сезон наведала каля шасці тысяч чалавек.

Адпачываючыя ў гэтым лагеры турысты пакінулі аб ім у кнізе водгукаў цёплыя запісы.

А. СЫЧОВА.

БУДАЎНІЦТВА КАЛГАСНАГА ПАСЁЛКА

ВІЦЕБСК. Калгас «17 верасня» Пліскага раёна ператварае сваю цэнтральную сядзібу ў пасёлак гарадскога тыпу. Распрацаван і зацверджан генеральны план забудовы, разлічаны на дзесяць год. Для гэтай мэты гаспадарка прадугледзела выдаткаваць мільён рублёў.

План пачаў ажыццяўляцца. Працуе будаўнічая брыгада з шасцідзесяці чалавек. Кіруе ёю тэхнік Леанід Махальскі. Ёсць піларама, гантарэзка, сталярная майстэрня, неабходны транспарт.

Ужо справілі наваселле трыста сем'яў, а да канца года пераселяцца з хутароў усе астатнія калгаснікі. Запраектавана ўзвядзенне двухпавярховых жылых будынкаў, Палаца культуры на 800 месц, кінатэатра, сталовай, школы-інтэрната, камбіната бытавога абслугоўвання, гасцініцы, універмага, дома для састарэлых, дзіцячага сада і ясляў, бальніцы.

Тэрыторыя пасёлка будзе акружана фруктовым садам. Цяпер ён займае 50 гектараў, а праз некалькі год павялічыцца ў чатыры разы. На беразе маляўнічага возера плануецца разбіць парк культуры і адпачынку.

Перабудову вёсак энергічна распачалі многія сельгасарцелі Глыбоцкага, Талачынскага, Лепельскага, Дрысенскага і іншых раёнаў. У новыя дамы сёлета ўсяліліся больш дзвюх тысяч сем'яў калгаснікаў Віцебшчыны.

ПА РОДНАЙ КРАІНЕ

Сямігодкі тысячны дзень

Савецкі народ нядаўна адзначаў тысячны дзень сямігодкі. Тысяча дзён упартай і натхнёнай працы, смелых і жаданых здзяйсненняў, пераўтварэння ў жыццё самых дзёрзкіх задум! На XXI з'ездзе партыі таварыш М. С. Хрушчоў гаварыў:

«Сямігоддзе, у якое мы ўступілі,— гэта новы важны, можна сказаць, рашаючы рубеж на шляху гістарычнага развіцця нашай краіны. Камуністычная партыя, увесь савецкі народ цвёрда ўпэўнены, што яны возьмуць і гэты рубеж і выйдуць на шырокае плато, і тады адкрыюцца новыя прасторы, тады будзе лягчэй ісці наперад. Перад намі ясная і высакародная мэта. Для дасягнення гэтай мэты трэба добра папрацаваць. Такая праца ўзвышае чалавека, прыносіць яму задавальненне і шчасце».

Наша краіна выходзіць на шырокае плато, перад ёй адкрываюцца ўсё новыя і новыя прасторы. Сямігадовы план клопатамі і працай усяго савецкага народа выконваецца паспяхова. За першыя два гады сямігодкі пабудавана 2 180 буйных прамысловых прадпрыемстваў, 11 тысяч кіламетраў чыгунак і шасэйных дарог, больш за 11 тысяч кіламетраў магістральных трубаправодаў, жылыя дамы агульнай плошчай 163,5 мільёна квадратных метраў, вялікая колькасць школ, бальніц, дзіцячых і культурных устаноў.

Радзіма наша з дня ў дзень набірае сіл, наліваецца багатымі жыццёвымі сокамі. Мацнее яе эканамічная магутнасць, высока ўзнеслася над светам слава яе навукі, яе мастацтва. Расце міжнародны аўтарытэт Савецкага Саюза — прыхільніка міру на зямлі.

У гэтыя дні, напярэдадні XXII з'езда КПСС, з новай сілай разгарнулася ўсенароднае сацыялістычнае спаборніцтва за перавыкананне сямігадовага плана, за дастойную сустрэчу партыйнага з'езда, які прыме новую Праграму Камуністычнай партыі, праграму пабудовы камунізма ў нашай краіне.

З краю ў край на вялікіх прасторах Радзімы шумяць вятры працоўнай славы, творчых подзвігаў народа, які стварае цуды.

РАДКІ ВЯЛІКАГА ЛЕТАПІСУ

День першы

Уступіла ў строй шахта «Ветка-Глыбокая» трэста «Куйбышаўвугаль». Яна разлічана на здабычу чатырох тысяч тон каксуючыхся вуглёў у суткі.

Дваццаць трэці

У Нікалаеве спушчана на ваду буйнейшая ў свеце кітабойная база «Савецкая Украіна» водазмяшчэннем 44 тысячы тон.

Дваццаць сёмы

Пачаў работу нечарговы XXI з'езд КПСС. З'езд прыняў рэзалюцыю па дакладу М. С. Хрушчова «Аб кантрольных лічбах развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1959—1965 гады», зацвердзіў кантрольныя лічбы развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1959—1965 гг.

Восемдзесят пяты

На Магнітцы пушчаны самы магутны ў краіне пракатны стан — слябінг.

Дзевяноста восьмы

Уступіў у строй першынец Курскай магнітнай анамаліі Паўднёва-Карабкоўскі руднік.

Сто трыццаць дзевяты

Буйнейшы ў свеце паветраны карабель «ТУ-114» зрабіў першы дальні выпрабавальны палёт.

Дзвесце дваццаць першы

Нова-Крыварожскі горнаўзбагачальны камбінат даў першую прадукцыю.

Дзвесце пяцьдзесят сёмы

Савецкая касмічная ракета дасягнула паверхні Месяца.

Трыста пяцьдзесят чацвёрты

Апублікавана паведамленне ўрадавай камісіі аб паспяховых выпрабаваннях атамнага ледакола «Ленін».

Чатырыста дзевяноста першы

На сесіі Вярхоўнага Савета СССР выступіў М. С. Хрушчоў з дакладам «Аб адмене падаткаў з рабочых і служачых і іншых мерапрыемствах, накіраваных на павышэнне дабрабыту савецкага народа».

Пяцьсот сорак дзевяты

Уведзена ў дзеянне першая доменная печ Карагандзінскага металургічнага завода.

Шэсцьсот трыццаць другі

«Свабоду і незалежнасць усім каланіяльным народам, вырашыць праблему ўсеагульнага раззбраення!» — выступленне М. С. Хрушчова на XV сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.

Шэсцьсот восемдзесят сёмы

Адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны адкрыццю універсітэта дружбы народаў.

Семсот другі

У Крывым Розе на заводзе імя Леніна ўведзена ў эксплуатацыю самая буйная домна ў свеце.

Восемсот трыццаць трэці

Першы ў свеце касманаўт Юрый Гагарын зрабіў палёт на касмічным караблі «Усход».

Дзевяцьсот сорак другі

Апублікаваны праект Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Дзевяцьсот сорак дзевяты

Запушчаны на арбіту касмічны карабель «Усход-2» з лётчыкам-касманаўтам маёрам Г. С. Цітовым на борце.

Дзевяцьсот восемдзесят чацвёрты

Здадзена ў эксплуатацыю самая буйная ў свеце Волжская ГЭС імя XXII з'езда КПСС.

Тысячны

Будаўнікі і мантажнікі ўсесаюзнай ударнай камсамольскай будоўлі — Прыбалтыйскай ДРЭС завяршылі мантаж пятага 100-тысячнага генератара, пусціць які абавязаліся да адкрыцця XXII з'езда партыі.

Лепшая зборшчыца Мінскага радыёзавода Людміла Бандарчук.

Трыпціх работы мастака В. Цвірко «На зямлі беларускай».

Першы ў рэспубліцы

САЛІГОРСК. Салігорцы атрымалі добры падарунак ад будаўнікоў — будынак першага ў рэспубліцы горнага тэхнікума. У чатырохпавярховым корпусе размясціліся вучэбныя кабінеты, лабараторыі, чарцёжная, чытальная, бібліятэчная, актавая і гімнастычная залы.

Пачаўся прыём заяў у тэхнікум. У гэтым годзе будзе прынята 200 чалавек, у тым ліку 60 — на дзённае і 140 — на вячэрняе аддзяленні. Тэхнікум будзе рыхтаваць спецыялістаў па горнай электратэхніцы, абсталяванню хімічных заводаў, тэхналогіі мінеральных угнаенняў.

ГАСПАДАРЫ СВАЙГО ЛЁСУ

У МАЛЯЎНІЧЫМ кутку Пружанскага раёна размясцілася вёска з паэтычнай назвай Крыніца — цэнтр калгаса імя Сталіна. Адсюль бярэ свой пачатак Белавежская пушча з векавымі хвоямі ды разгалістымі волатамі-дубамі. На захад ад сяла, там дзе канчаецца вуліца, залягаюць тарфянікі.

— Калісьці тут было непралазнае балота, — расказвае калгасніца Вольга Глушко. — Людзі па пояс у вадзе касілі асаку для жывёлы. А зараз на гэтых мясцінах збіраем багатыя ўраджаі цукровых буракоў, кукурузы, жыта, пшаніцы, бульбы і іншых сельскагаспадарчых культур. Тарфянікі сталі сапраўднай хлебніцай калгаса.

— Без тэхнікі, якой нас забяспечыла Савецкая ўлада, мы, зразумела, не адолелі б балота,— гаворыць старшыня калгаса Іван Ільіч Захарынскі. — Хіба мог пры панскай Польшчы селянін беднай і забітай вёскі марыць аб асушцы. Вядома, не. А мы ўжо асушылі 1 200 гектараў былой твані.

Шаснаццаць год прайшло з таго часу, калі неба Радзімы ачысцілася ад гарматнага дыму. Даўно залечаны раны вайны. Не пазнаць зараз вёскі Крыніцы. З попелу і развалін вырасла прыгожае сяло з новымі светлымі дамамі. Багацце і радасць прышлі ў гэтыя дамы. Добрай мэбляй абстаўлены пакоі калгаснікаў, у кожнай хаце — радыё.



Крыніцай дастатку з'яўляецца высокая культура земляробства. Менавіта дзякуючы гэтаму, калгас з кожным годам развіваецца, мацнее яго эканоміка. На палях арцелі працуе больш дзесятка розных трактараў. Ёсць аўтамашыны, камбайны, касілкі, складаныя малатарні, жняркі, сенакасілкі, на розных участках калгаснай вытворчасці працуе больш 20 электраматораў.

Непазнавальна змянілася і культурнае аблічча калгаснай вёскі. Кнігі, газеты і часопісы сталі жыццёвай неабходнасцю хлебароба. Да яго паслуг — дзве бібліятэкі, кніжны фонд якіх перавышае пяць тысяч экземпляраў мастацкай, сельскагаспадарчай, тэхнічнай і іншай літаратуры.

У калгасе ёсць тры клубы. Там працаўнікі сяла праводзяць свой адпачынак: глядзяць кінафільмы, канцэрты мастацкай самадзейнасці і прафесіянальных артыстаў.

Пры панскай Польшчы на ўвесь Крыніцкі сельсавет не было ніводнага чалавека з вышэйшай адукацыяй, а цяпер іх дзесяткі. Многія юнакі і дзяўчаты сталі інжынерамі, настаўнікамі, урачамі. Так, два сыны былога бедняка Івана Андрэевіча Саўчука з вёскі Сухаўшчына Іван і Уладзімір закончылі Ленінградскую медыцынскую акадэмію, а трэці сын Аляксей заканчвае вучобу ў Ленінградскім харчовым інстытуце.

Не галеча, а багацце, не цемра, а навука сталі спадарожнікамі ў жыцці калгасніка. І нічога дзіўнага ў гэтым няма. Гаспадарамі зямлі ў нас з'яўляюцца самі сяляне і працуюць яны не на паноў, а на сябе.

В. ПАШКЕВІЧ.

На здымках: 1. Цялятніца калгаса імя Сталіна Яўгенія Рабчук каля свайго дома. 2. У калгаснай бібліятэцы.

АБ ЧЫМ ГАВОРАЦЬ ЛІЧБЫ

Колішняя Магілёўская губерня па тэрыторыі і колькасці насельніцтва была, прыкладна, у два разы большай за Магілёўскую вобласць у сучасных яе межах, але мела вельмі слаба разгорнутую сетку медыцынскіх устаноў. У губерні налічвалася толькі 59 бальніц на 1.300 ложкаў. Лячэнне ў бальніцах праводзілася за аплату. Яшчэ горш абстаяла справа з медыцынскімі кадрамі: на 10.000 гарадскога насельніцтва даводзіўся адзін урач і фельчар, а ў сельскай мясцовасці адзін урач абслугоўваў 30—50 тысяч насельніцтва.

Непазнавальна змяніўся стан аховы здароўя ў вобласці за гады Савецкай улады. Цяпер тут функцыяніруюць 577 лячэбна-прафілактычных устаноў, з іх 128 бальніц. У кожным раёне ёсць бальніца з паліклінікай, жаночай і дзіцячай кансультацыямі, лабараторыяй, рэнтгенаўскімі кабінетамі, не кажучы ўжо аб сельскіх бальніцах і амбулаторыях, якія працуюць на перыферыі.

У сучасны момант у медыцынскіх установах вобласці працуе 1.304 урачы і больш за шэсць тысяч сярэдніх медыцынскіх работнікаў. На 10 000 насельніцтва прыпадае па 11 урачоў і 50 сярэдніх медыцынскіх работнікаў.

Шырокае ўжыванне ў медыцынскай практыцы атрымалі так званыя «мечаныя атамы», якія атрымліваюцца шляхам штучнай радыёактыўнасці. Карыстаючыся асобымі лічыльнікамі, пры дапамозе «мечаных атамаў» урачы вызначаюць злаякасныя пухліны ў ранняй стадыі, а гэта павялічвае эфектыўнасць лячэння. Радыёактыўныя ізатопы, рэнтгенаўскія праменні паспяхова ўжываюцца пры лячэнні розных захворванняў.

У практыцы работы хірургаў шырэй сталі ўжывацца аперацыі сардэчна-сасудзістай сістэмы, лёгкіх. Пры правядзенні ўнутрысардэчных аперацый у буйных клініках ужываецца апарат штучнага кроваабарачэння, які паспяхова замяняе работу сэрца на перыяд аперацыі.

Айчыннай прамысловасцю выраблены універсальны сасуда-нервасшывальны апарат, які амерыканцы на выстаўцы ў Бруселі назвалі «спадарожнікам» у медыцыне. За апошнія гады ўзнікла і шырока ўвайшла ў практыку новая галіна медыцынскай навукі — анестазіялогія. Замест старых наркозных апаратаў з'явіліся сучасныя апараты для дазіравання ўвядзення наркозу. У анестазіялогіі ўжываюцца новыя лякарственныя рэчывы, вытворчасць аперацыі пры паніжанай тэмпературы з ужываннем для абязбольвання актыўных фармакалагічных прэпаратаў, а таксама прэпаратаў, якія паніжаюць крывяны ціск.

М. ТРУСАВА.
загадчык абласнога аддзела аховы здароўя.

САДЫ НА БРАГІНШЧЫНЕ

Куды ні кінь вокам — усюды тут сады. Звыш 1400 гектараў займаюць яны на Брагіншчыне. Зялёныя, галінастыя, стаяць яблыні, грушы, вішні, слівы. Пад цяжарам сакавітых пладоў гнуцца долу галіны антонавак, ранетаў, штрыфеляў. Багаты ўраджай фруктаў сёлета на Брагіншчыне. Па семдзесят-восемдзесят цэнтнераў пладоў збіраюць члены садова-гародных брыгад.

Асабліва вядомы сваімі зялёнымі садамі на Брагіншчыне калгас імя Тэльмана. Штогод калгас атрымлівае ад рэалізацыі фруктаў звыш 100 тысяч рублёў прыбытку ў новых грошах. Сёлета прыбытак будзе яшчэ большы, бо ўраджай вырашчаны яшчэ лепшы чым летась. З аднаго гектара атрымана па 80 — 90 цэнтнераў яблык і груш. Садоўнікі вырошчваюць у сваіх садах абрыкосы, алычу.

Добры ўраджай сабралі і садоўнікі сельгасарцелі імя Леніна. Ад рэалізацыі пладоў у калгасную касу паступіла звыш 50 тысяч рублёў прыбытку. Апрача гэтага, яшчэ будуць адгружаны на прыёмныя пункты дзесяткі тон фруктаў. Каля 50 тон яблык праўленне калгаса размеркавала на працадні калгаснікам.

Яўг. КРАЎЧАНКА.

Брагінскі раён,
Гомельская вобласць.

ДРУЖБА СУСЕДЗЯЎ

Агітбрыгаду «Дружба» — гэты малады калектыў добра ведаюць гледачы Ашмянскага раёна нашай рэспублікі і Вільнюскага Літоўскай ССР. Ён нарадзіўся ў выніку творчай садружнасці двух Дамоў культуры Беларусі і Літвы.

Дамы культуры абодвух раёнаў разам намячаюць рэпертуар, маршруты паездак, узгадняюць месцы сустрэч для сумесных выступленняў. Падрыхтаваную імі праграму за апошні час ужо глядзелі і слухалі ў 20 беларускіх і літоўскіх калгасах і саўгасах. Цяпер рыхтуецца новая праграма ў гонар XXII з'езда КПСС.

У творчай дружбе знаходзяцца і два іншыя калектывы гэтых раёнаў. У Ашмяны прыязджаў народны тэатр вільнюскага клуба імя Дзяржынскага. Ён паказаў свой спектакль «Пасля разлукі». Гэтымі днямі вядомы ў Беларусі Ашмянскі народны тэатр наведаў пасёлак Рудаміны Вільнюскага раёна і паказаў літоўскім гледачам свой спектакль «Паўлінка».

Бацькоў дастойныя дзеці

— Якія ў вас цудоўныя дзеці: дапытлівыя, разумныя, ветлівыя. Бачыў я іх за кнігамі, за цікавай гульнёй, за карыснай працай. Я проста ў захапленні, — так сказаў аб савецкіх дзецях турыст-беларус з Канады Іван Новік.

І гэта не выпадкова. У савецкіх дзяцей ёсць з каго браць прыклад. Іх дзяды ішлі на штурм Зімняга палаца, заваявалі Савецкую ўладу і адстаялі яе ў баях з ворагамі рэвалюцыі; іх бацькі, маці, старэйшыя браты і сёстры працуюць на заводах і фабрыках, а вечарам позна сядзяць за кнігамі. У савецкай краіне няма ні адной сям'і, дзе б падоўгу не вяліся гутаркі аб мінулым і будучым нашай Радзімы, дзе б не абмяркоўваліся новыя дасягненні савецкага народа ў навуцы і тэхніцы. Усё гэта пакідае ў сэрцах рэбят добры след. Дзеці стараюцца ва ўсім быць падобнымі на дарослых. Нават гульні савецкіх дзяцей адлюстроўваюць тое, чым заняты дарослыя. Пераймаючы іх, дзеці гуляюць у будаўнікоў, машыністаў, касманаўтаў.

У маі 1962 года спаўняецца сорак год піянерскай арганізацыі Савецкага Саюза. Дзеці вырашылі да гэтага тэрміну сабраць матэрыялы аб гісторыі піянерскай арганізацыі, арганізаваць музей Леніна, куткі, якія расказваюць аб жыцці слаўных сыноў і дачок сваёй Радзімы, дапамагаць народу ў будаўніцтве камуністычнага грамадства.

Прайшоў год. Цяжка нават пералічыць тое, што зроблена рэбятамі, якія выконваюць сваю піянерскую двухгодку.

Піянеры Беларусі абяцалі сабраць у першы год двухгодкі 15 тысяч тон металалому для будаўніцтва газаправода «Дружба». Сабрана 19 тысяч тон. Тры тысячы тон металалому — гэта ўклад толькі школьнікаў Гродзенскай вобласці ў выкананне двухгодкі.

«Наша Радзіма павінна ператварыцца ў квітнеючы сад», — гавораць савецкія дзеці. І яны ўсё робяць, каб Радзіма была такой. У вольны час з саджанцамі, рыдлёўкамі выходзяць школьнікі на вуліцы гарадоў і вёсак Беларусі. Вясной гэтага года яны заклалі 464 паркі і скверы.

Школьнікі Гомельшчыны вырашылі: «Акружым дзіцячыя сады садамі фруктовымі». Толькі ў першы год двухгодкі вакол школ, дзіцячых садоў, школ-інтэрнатаў раскінуліся пасаджаныя дзецьмі сады ўжо на 130 гектарах.

Каля кожнай школы ёсць прышкольныя ўчасткі. Тут школьнікі праводзяць вопыты, якія дапамагаюць ім у вывучэнні батанікі, і нават выводзяць новыя гатункі культур. Аб карысці, якую прыносяць гэтыя вопыты, гаворыць ужо той факт, што на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве быў арганізаваны агляд «Юныя вопытнікі ў сельскай гаспадарцы».

У час летніх канікул вучні, якія жывуць у калгасах, дапамагаюць на птушкафермах, у паляводчых брыгадах, на малочных фермах. Яны арганізуюць і свае паляводчыя брыгады. Васемсот тысяч га зямлі апрацоўваецца школьнай дзеваторай. На сваіх участках піянеры ўбіраюць ураджай кукурузы па 1 000 цэнтнераў зялёнай масы з гектара.

У савецкай школе ўдзяляецца вельмі вялікая ўвага працоўнаму выхаванню дзяцей. У час урокаў працы вучні ходзяць на заводы, фабрыкі, авалодваюць рамяством. Скончана школа, і ў маладога чалавека разам з атэстатам сталасці, які дае права на паступленне ў вышэйшую навучальную ўстанову, — дыплом аб набытай прафесіі.

Паміж рабочымі і вучнямі існуе вялікая дружба. Дзеці прыходзяць на вытворчасць, а рабочыя наведваюць школу. Гэта дае магчымасць больш поўна задаволіць попыт цікаўнай савецкай дзетвары. Рабочая моладзь ходзіць са школьнікамі ў турысцкія паходы, абмяркоўвае новыя кінакарціны, кнігі, тэатральныя пастаноўкі, займаецца са школьнікамі ў гуртках «умелыя рукі».

Рэбяты ганарацца дружбай з рабочымі, стараюцца ўсё пераймаць у старэйшых таварышаў. Так, напрыклад, рабочыя брыгады змагаюцца за званне брыгад камуністычнай працы. Па прыкладу рабочых лепшым атрадам школы сталі прысвойваць званні «Атрад — спадарожнік сямігодкі». Асноўным законам гэтых атрадаў з'яўляецца добрая і выдатная вучоба і актыўны ўдзел у грамадска-карысных справах. Такіх атрадаў у Беларусі ўжо налічваецца 5257.

Так, дарослыя асабістым сваім прыкладам прышчапляюць дзецям любоў да працы, ведаў. Сапраўды добрая, дастойная змена расце ў Савецкай краіне. Дапытлівыя, усебакова развітыя, яны ўмеюць не толькі марыць, але і ўносіць свой пасільны ўклад у агульную справу. Так, наш суайчыннік Новік не памыліўся: савецкія дзеці — цудоўныя дзеці! Таму што яны жывуць у грамадстве, дзе няма эксплуатацыі чалавека чалавекам, дзе чалавек чалавеку — друг.

Л. ВОЛЬСКАЯ.

МЫ НЕ МОЖАМ ТУТ ПРЫВЫКНУЦЬ

Камітэту за вяртанне на Радзіму і рэдакцыі газеты «Голас Радзімы».

Я, Іода Канстанцін Антонавіч, жыхар в. Яцкава Белакарэцкага сельсавета Валожынскага раёна Мінскай вобласці, прашу аказаць мне дапамогу ў вяртанні майго брата Іода Аляксандра Антонавіча з Ізраіля на Радзіму.

Адначасова прашу апублікаваць яго пісьмо, якое ён прыслаў мне, у вашай газеце.

Іода К. А.

Добры дзень, нашы дарагія Канстанцін, Маня і Толік!

Дарагі брат, прабач мне за доўгае маўчанне. Напішы, як вы жывяце, як ваша здароўе, якія навіны ў вёсцы. За гэты час усё ў маім жыцці так змянілася, што я не ведаю, з чаго пачаць.

Вось ужо амаль 10 месяцаў, як мы прыехалі ў Ізраіль. Мы ўжо даўно збіраліся напісаць вам пісьмо, але не маглі паведаміць свайго адрасу, таму што за гэты час змянілі некалькі кватэр. Нядаўна мы купілі кватэру на выплату на 22 гады. Гэта каштуе нам вельмі многа, і мы вельмі многа пазычылі грошай. Цяпер трэба неяк выкручвацца.

Справа не толькі ў кватэры. Работу тут знайсці вельмі цяжка, а калі яе і знойдзеш, дык трэба пакласці ўсе сілы. Гарачыня невыносная, даходзіць да 45°, і 9 месяцаў няма дажджоў. Мы валяемся на падлозе ад гарачыні. Тут мы вельмі адзінокія, не маем з кім пагаварыць, сумуем па Радзіме і прывыкнуць ніяк не можам. Тое, што зарабляем, мы павінны аддаваць за даўгі, і на жыццё амаль нічога не застаецца. Міла была 8 месяцаў у кібуце. Цяпер мы яе забралі і хочам вучыць у школе, але гэта вельмі дорага каштуе.

Я працую на заводзе токарам, а жонка працуе санітаркай у бальніцы, і гэта толькі часовая работа, а атрымаць пастаянную ў мае гады і пры маім здароўі тут проста немагчыма.

Дзеці не могуць ніяк прывыкнуць і настайваюць, каб мы вярнуліся на Радзіму, і мы таксама не можам тут жыць. Мы ўжо былі ў пасольстве СССР і падалі заяву. Нам сказалі, што можам выехаць на працягу года, але трэба мець ад цябе гарантыйнае абавязацельства, што забяспечыш нас на першы час жылплошчай. Дарагі брат, калі можаш дастаць такую спраўку, то абавязкова прышлі чым хутчэй.

На гэтым канчаю, моцна, моцна цалуем вас усіх. Заставайцеся жывы і здаровы. Чакаю хуткага адказу з нецярпеннем.

Твой брат АЛЯКСАНДР.

Я яшчэ магу працаваць

Калі я быў поўны сіл і здароўя, калі без стомы працаваў старшым майстрам кавальскага цэху на цяжкіх молатах, мяне трымала дырэкцыя завода. Але вось усю маю сілу і здароўе выкачалі і прапанавалі разлік. Зараз атрымліваю пенсію, якой мне ледзь-ледзь хапае, каб звесці канцы з канцамі.

А я ж яшчэ мог бы працаваць, быць карысным, але сярод беспрацоўных многа ёсць моцных, здаровых людзей. Калі ты тут, у «вольным свеце», нарадзіўся батраком, то батраком і памрэш. Вось гэта і нараджае нярэдка сярод простых людзей Захаду песімізм, упадніцкія настроі.

Г. БАГДАНАЎ.

Францыя.

ЦЯЖКА БЕЗ ЦЯБЕ, РАДЗІМА!

Пакутлівы сум па Радзіме! Дзе б ні знаходзіўся чалавек, нязменна паўстаюць перад яго вачыма дарагія сэрцу мясціны, дзе ён нарадзіўся, зрабіў першыя крокі, сказаў «мама», пераступіў школьны парог, а затым адправіўся ў вялікую дарогу жыцця.

У 1944 годзе нямецка-фашысцкія варвары вывезлі мяне, беларускую дзяўчыну, з роднай вёскі Ламачына, што на Аршаншчыне, на чужыну, у рабства. Многа давялося перажыць мне ў свае 18 год. Канцлагеры і падневольная праца, бадзянні ў пошуках кавалка хлеба. Нарэшце Францыя. Тут звязала я лёс з добрым чалавекам — хлопцам Жоржам Аблінам з Парыжа: мы пакахалі адзін аднаго.

Нядаўна вырашыла наведаць родныя мясціны, пабачыцца з бацькамі, сустрэць сяброў дзяцінства. Цяжка словамі перадаць тыя пачуцці, якія апанавалі мяне, калі я ў пагранічным Брэсце пасля доўгіх год разлукі ступіла на родную зямлю, пачула родную мову. Сорамна прызнацца, але ўсю дарогу ад Мінска да Оршы я праплакала ад радасці. Не адыходзіла ад вагоннага акна, углядалася ў праплываўшыя міма вёскі і гарады, у твары сустрэчных (а раптам хто-небудзь знаёмы трапіцца!). Цудоўны Мінск у пазалоце праменняў ранішняга сонца. А ў Оршы на вакзале абдымкі і пацалункі блізкіх. Яшчэ гадзіна-дзве, і я ля роднага парога.

Вось яна, мая Радзіма, у разлуцы з якой працякалі бясконца доўгія семнаццаць год! Родны куток, увесь у зеляніне дрэў, згубіўся ў прасторах жытніх палёў. Як і раней, нясе свае светлыя струменні імклівая рэчка Адраўка.

Колькі новага з'явілася тут без мяне! Бярозка і куст бэзу, якія я пасадзіла перад акном нашага дома яшчэ школьніцай, выраслі вялікія і ветліва махаюць галінкамі. Не пазнаць роднай вёскі! Электрычнасць, радыё, клуб, магазін — усяго гэтага не было раней. Працуюць мае аднавяскоўцы хто на чыгунцы, а хто на зямлі. Многа пабудавана новых цагляных дамоў пад бляшанымі і чарапічнымі дахамі. А ў дамах — швейныя машыны, радыёлы, нікеляваныя ложкі, дабротнае адзенне і абутак. Матацыклы, веласіпеды (па тры-чатыры на сям'ю) — цяпер не рэдкасць. Добра жывуць людзі, заможна. Мой пляменнік Валодзя Варанькоў працуе токарам на заводзе швейных машын у Оршы і зарабляе каля 100 рублёў у месяц. Або ўзяць сям'ю Цітовых — суседзяў, у якіх шасцёра дзяцей. Ад дзяржавы на выхаванне дзяцей яны атрымалі не адну тысячу рублёў, і ўсе дзеці знайшлі сваё месца ў жыцці. Самая малодшая — Соня канчае сярэднюю школу.

Равеснікі майго дзяцінства атрымалі адукацыю. Зайздрошчу, што яны змаглі выйсці ў людзі. Узяць, напрыклад, Тоню Сідаровіч, з якой я хадзіла калісьці ў пачатковую школу. Яна скончыла інстытут і цяпер настаўнічае на Віцебшчыне. Або мае родныя. Брат Валодзя атрымаў сярэднюю тэхнічную адукацыю і працуе на адным з заводаў у Днепрапятроўску, мае паблізу ад горада ўласны дом з садам і агародам. Пеця водзіць пасажырскія паязды. Добра жыве на Далёкім Усходзе і брат Адам, таксама паравозны машыніст.

Вельмі шкадую, што з-за недахопу часу мне не давялося пабываць усюды, дзе хацелася б. Але і тое, што ўбачыла, гаворыць аб многім. Памятаю цяжкі 1944 год, калі Орша ляжала ў развалінах і папялішчах. А зараз не пазнаць старажытнага горада — так ён расквітнеў і папрыгажэў: дзесяткі новых шматпавярховых дамоў, асфальтаваныя вуліцы, добраўпарадкаваны пасёлак тэкстыльшчыкаў ільнокамбіната. А абласны горад Віцебск яшчэ лепшы. Вялізны вакзал са светлымі прасторнымі заламі, шырокі праспект Кірава, новыя будынкі тэатра і універмага каля Заходняй Дзвіны. Паркі, скверы, мора кветак. Мноства магазінаў з прамысловымі і прадуктовымі таварамі. Над горадам — стрэлы вежавых кранаў, растучыя ў вышыню новыя дамы.

А лепш за ўсё — людзі, вясёлыя, добра апранутыя. Вялікія чэргі ля кінатэатраў і газетных кіёскаў. Народ, які столькі будуе і імкнецца да міру, не можа і думаць аб вайне. З кім я ні гутарыла: з маладымі і старымі людзьмі — усе яны ў адзін голас заяўляюць: «Нам патрэбен мір!»

Дзякую савецкаму консулу ў Парыжы за прадастаўленую мне магчымасць пабываць на Радзіме. У час майго знаходжання тут мне ніхто не чыніў ніякіх перашкод, я бывала, дзе хацела, і што хацела, бачыла. Думаю праз некаторы час зноў прыехаць у родныя мясціны. На гэты раз ужо з мужам. Цяжка жыць у разлуцы з табой, Радзіма!

Ніна МАЗОЛЬ-АБЛІН.

На здымку: Ніна Мазоль-Аблін на радзіме.

ПАД ПАЎДНЁВЫМ КРЫЖАМ

Сідней — буйнейшы порт і фінансава-прамысловы цэнтр на аўстралійскім кантыненце. Сюды штодзень заходзяць 20—30 акіянскіх суднаў пад рознымі флагамі. Цэнтр горада забудаваны масіўнымі будынкамі банкаў, страхавых кампаній, розных гандлёвых кантор.

1 жніўня ў Сіднеі адкрыўся кірмаш, у якім удзельнічалі 22 краіны. Гэта першы вялікі кірмаш у гісторыі Аўстраліі.

Вялікай увагай наведвальнікаў карысталіся павільёны сацыялістычных краін і асабліва Савецкага Саюза.

Калі ў Еўропе ішла вайна, калі фашысцкія орды знішчалі ў акупіраваных імі краінах усё жывое, народы з надзеяй глядзелі на Савецкі Саюз. Гэта была адзіная краіна, якая змагла заступіць дарогу гітлераўскім захопнікам і цалкам разграміць іх.

У той цяжкі для ўсіх свабодалюбівых народаў час буржуазная прэса не скупілася на апісанне падзей усходняга фронта. Нават з'явіліся нарысы аб гасціннасці, гераізме і мужнасці савецкіх людзей. Не заўсёды гэта былі добрыя матэрыялы, але ўсё ж аўстралійцы зразумелі, што рускія ў абдымку з мядзведзямі не ходзяць і ў выпадку неабходнасці ўмеюць пастаяць за сябе.

Але як толькі рассеяўся дым вайны, калі агульны наш вораг быў разбіты, заправілы капіталізму, баючыся згубіць свае прыбылі на ваенных заказах, зноў пачалі старую паніхідную песеньку аб небяспецы камунізма.

Ды зараз не тыя часы. Кожнаму радавому аўстралійцу цяпер зразумела, што не камуністы, а спрадвечныя ворагі працоўных — капіталісты імкнуцца да захопу чужых тэрыторый і заняволення народаў.

Савецкі павільён увасабляў сабой мірныя імкненні працоўных краіны сацыялізма. Усіх наведвальнікаў здзіўляла ў ім багацце самых сучасных прылад працы — сельскагаспадарчых машын айчыннага вырабу, у тым ліку Мінскага трактарнага завода, дарожнай і буравой тэхнікі, легкавых машын, верталётаў.

Ля ўваходу ў павільён з левага боку былі размешчаны макеты натуральнай велічыні першага і другога спадарожнікаў зямлі, запушчаных савецкімі людзьмі ў космас, арктычная палатка і іншыя экспанаты, звязаныя з нястомным шукальнікам — чалавекам. З правага боку вісела карта свету з абазначэннем гандлёвых сувязей Савецкага Саюза. У самім павільёне экспанаваліся вырабы лёгкай і цяжкай прамысловасці, а таксама тавары шырокага ўжытку.

Сярод наведвальнікаў бывалі розныя людзі. Адны з недавер'ем кранаці рукамі новыя савецкія станкі і машыны, каб упэўніцца, ці не міраж гэта, другія шчыра захапляліся ўсім і пакідалі запісы ў кнізе водгукаў: «Мне вельмі падабаецца», «Я ў захапленні ад Савецкага Саюза», «Мір і праца з вамі».

Аўстралійцы — гасцінны народ. Яны хутка сыходзяцца з любым іншаземцам. Але ў апошні час многія прыкметна астылі. Іх давер да іншаземцаў пахіснулі новыя пасяленцы. Асабліва вылучыліся контррэвалюцыянеры, якія ўцяклі ў Аўстралію з Венгрыі. Адзін з іх не так даўно праславіўся тым, што ўкраў дзіця з мэтай атрымання выкупу ад бацькоў. Калі ж справа з выкупам праваліўся, ён забіў хлопчыка і спрабаваў уцячы. Але паліцыя затрымала гэтага звера ў Каломба.

Не лічацца з гасціннасцю аўстралійцаў і іншыя бежанцы з Венгрыі. Яны ўжо зрабілі каля 800 злачынстваў.

У сувязі з венгерскімі падзеямі мясцовая прэса трубіла аб гэтых людзях, як аб змагарах-пакутніках. А цяпер сарамліва або, як у нас кажуць, толькі ў паўголаса ўспамінае аб іх «ратных подзвігах» пад Паўднёвым Крыжам Аўстраліі.

Але вернемся да выстаўкі. У суботу, 6 жніўня, дзень быў не рабочы і выставачная плошча не змагла змясціць наведвальнікаў. Усе павільёны і падыходы да іх былі запоўнены людзьмі. Усім хацелася паглядзець, што ў іх ёсць, і даведацца, як зараз жывуць савецкія людзі.

Абслугоўваючы персанал савецкага павільёна ветліва сустракаў гасцей. Многія з іх дасканала валодалі англійскай мовай.

Багатая руская мова, але ў ёй не знайсці слоў, каб поўнасцю выказаць сваё захапленне дасягненнямі савецкай навукі і тэхнікі. Першы карабель «Усход» з Ю. Гагарыным на борце. Палёт гэтага простага рускага хлопца ў космас збянтэжыў зласліўцаў, а прагрэсіўнае чалавецтва захапляецца яго гераізмам і поспехамі, дасягнутымі ў час гэтага палёту.

Вялікі рускі пісьменнік М. В. Гогаль некалі сказаў, што прыязджаць да нас будуць не за пянькой, а за ведамі. Збыліся яго словы. Не пянькой, а самай сучаснай у свеце тэхнікай славіцца Савецкі Саюз. На сіднейскім кірмашы былі адноўлены старыя і падпісаны новыя гандлёвыя пагадненні. Цяпер часцей стануць заходзіць да нас акіянскія судны пад чырвоным флагам з сімвалічнай эмблемай — серп і молат. Блізкай стане далёкая Аўстралія для рабочага з Мінскага трактарнага завода і бліжэй будзе наша Радзіма да нас, эмігрантаў.

С. Б.

Сідней.

Імёны лепшых — у Кнізе гонару

У віцебскую гарадскую Кнігу гонару заносяцца прозвішчы пераможцаў перадз'ездаўскага сацыялістычнага спаборніцтва. Пяць чалавек ужо ўдастоены гэтага гонару. Гэта лепшыя людзі горада — слесар-зборшчык завода імя Кірава Анатолій Аніхімоўскі, памочнік майстра дывановага камбіната Пётр Клімкоў, слесар завода заточных станкоў Уладзімір Малыжэнкаў, швачка фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» Роза Петрачэнка і токар завода імя Камінтэрна Аляксей Казлоўскі.

НА ЗДЫМКАХ: Роза Петрачэнка і Аляксей Казлоўскі.

Удзельнікі марша ў Маскве

Тыя, каму давялося праязджаць у гэтыя дні па шасэ Масква — Брэст, з цікавасцю спынялі погляд на маляўнічай групе людзей, якія крочылі па абочыне дарогі. Яны неслі ў руках плакаты з белага пласціката. На першым з іх буйнымі чорнымі літарамі надпіс: **«Амерыкана-еўрапейскі марш за мір Сан-Францыска — Масква».** На астатніх плакатах — лозунгі, якія заклікаюць да раззбраення, забароны ядзернай зброі, скасавання ваенных дагавораў.

Гэты марш пачаўся дзесяць месяцаў назад, а ў канцы верасня яго ўдзельнікі прышлі ў Маскву. Ззаду 10 тысяч кіламетраў і шэсць краін.

У дарозе ўдзельнікі марша часта гутарылі з савецкімі людзьмі. І ва ўсіх выказваннях савецкіх людзей гучала адна і тая ж думка: перадайце сваім народам, што мы цвёрда стаім за мір.

Пад Мінскам удзельнікам марша сустрэўся стары беларус. Ён грунтоўна распытаў аб мэтах і задачах паходу, аб пройдзеным шляху, а затым сказаў:

— У нас, сынкі, вы не знойдзеце ні аднаго чалавека, які хацеў бы новай вайны .Мы вельмі многа перажылі, вельмі свежае яшчэ гора, прынесенае мінулай вайной, каб людзі без агіды маглі думаць аб новай. Але калі на нас зноў нападуць, мы ўсе, нават такія старыя, як я, пойдзем ваяваць. І гора тады тым, хто развяжа вайну!

У Маскве ўдзельнікі паходу правядуць некалькі дзён, пазнаёмяцца з горадам, з масквічамі, а потым раз'едуцца па дамах. Мы верым, што яны павязуць з сабой глыбокае перакананне ў шчырай міралюбнасці савецкага народа, у яго рашучасці ўсімі сіламі абараняць і ўмацоўваць мір на зямлі.

Ю. ГЕНЕРАЛАЎ.

ПА ТУРЫСЦКАЙ ПУЦЁЎЦЫ

БЯРОЗА. З вялікай карысцю праводзяць свае водпускі будаўнікі Бярозаўскай ДРЭС. Нядаўна з Румынскай Народнай Рэспублікі вярнуўся тынкоўшчык Уладзімір Хандога, дзе ён адпачываў на курорце «Эфорыя», пабываў у Бухарэсце, зрабіў экскурсію па ўзбярэжжы Чорнага мора. Добра адпачыўшы, Уладзімір Хандога прывёз шмат уражанняў аб жыцці, працы і культуры румынскага народа.

Цясляр прамысловага ўчастка, ударнік камуністычнай працы Юганэс Крузберг напярэдадні свайго водпуску зайшоў у пабудком і папрасіў выдзеліць яму пуцёўку ў санаторый або дом адпачынку, размешчаны ў Эстоніі.

— Хочацца пабываць у родных мясцінах, — сказаў ён.

Просьба Крузберга задаволена. Ён атрымаў пуцёўку ў эстонскі санаторый «Пярну».

Будаўнікоў ДРЭС прымалі многія санаторыі і дамы адпачынку нашай краіны. Багер земснарада Рыгор Архіпаў пабываў у санаторыі «Адлер», у доме адпачынку «Беларусь»— матарыстка Еўдакія Аўсяннікава.

ГОРАД НАД ДНЯПРОМ

У МАЛЯЎНІЧЫМ месцы, там, дзе зліваюцца Днепр і Сож, раскінуўся старажытны горад Лоеў. Цудоўная карціна адкрываецца з высокага берага: шырокі луг, пакрыты густой высокай атавай, падступае да самага горада, а ўдалечыні, быццам ў дымцы, відаць лясы.

Вось галоўная вуліца Лоева — Першамайская. Тут выраслі дабротныя двухпавярховыя жылыя дамы, новыя адміністрацыйныя будынкі, добрыя магазіны.

А як хораша і весела ў гарадскім дзіцячым садзе! У скверыку сярод засені дрэў і кустарнікаў гуляюць дзеці.

Горад добраўпарадкоўваецца. Зараз будуецца новая бальніца, яе кабінеты будуць аснашчаны навейшым медыцынскім абсталяваннем. Размяшчаецца яна ў фруктовым садзе. Узводзяцца будынкі гасцініцы, бібліятэкі, двухпавярховых жылых дамоў, магазінаў.

Любяць лаяўчане свой горад, штогод садзяць фруктовыя і дэкаратыўныя дрэвы. Толькі гэтай вясной пасаджана больш за 1 000 дрэваў.

На поўную магутнасць у райцэнтры працуюць цагельны завод, млын, фарбацэх, будаўнічая кантора, РТМС і іншыя прадпрыемствы.

Лоеў звязаны з населенымі пунктамі раёна, з абласным цэнтрам, іншымі гарадамі аўтобуснай сеткай, сюды лятаюць кожны дзень самалёты з Гомеля, заходзяць параходы і быстраходныя кацеры на падводных крыллях, якія курсіруюць па Дняпру.

Марыя ХАДАРЭНКА.



На здымку: будынак універмага ў Лоеве.

Эдуард Яраш — чэмпіён Еўропы

У Будапешце праходзіў чэмпіянат Еўропы па стральбе для жанчын і юнакоў. Выдатнага поспеху на гэтых спаборніцтвах дабіўся малады беларускі стралок мінчанін Эдуард Яраш. У стральбе з трох пастаў (3×30) ён выбіў 866 ачкоў і заваяваў званне чэмпіёна Еўропы сярод юнакоў. Вынік Эдуарда на 11 ачкоў лепшы, чым у яго бліжэйшага саперніка румына Когута.

НА ФУТБОЛЬНЫХ ПАЛЯХ

Пачаліся фінальныя гульні першынства Беларусі па футболу. Званне чэмпіёна аспрэчваюць шэсць каманд: мінскі «Спадарожнік», спартакаўцы Барысава і Пінска, магілёўскі «Металург» і брэсцкі «Лакаматыў». У першым туры маладзечанскія спартакаўцы сустрэліся з мінулагоднім чэмпіёнам Беларусі, уладальнікам кубка 1961 года — камандай «Спадарожнік». Сустрэча закончылася перамогай маладзечанцаў з лікам 4:1. Маладзечанскія футбалісты ўзначалілі турнірную табліцу.

Другой цэнтральнай сустрэчай была гульня паміж камандамі горада Барысава і Пінска. Цікавае спаборніцтва закончылася перамогай барысаўскіх футбалістаў з лікам 2:0.

Брэсцкі «Лакаматыў» прымаў у сябе футбалістаў з горада Магілёва. Перамаглі госці.

БУЙНЕЙШЫ РАЧНЫ ПОРТ БЕЛАРУСІ

Самы буйны ў Беларусі рачны порт Пхоў будуецца на рацэ Прыпяць недалёка ад Мазыра. Ужо гатовы 200 пагонных метраў прычальнай сценкі, абсталяванай магутнымі партальнымі кранамі.

Порт Пхоў будзе служыць буйным перавалачным пунктам пры перавозках вугалю, лесу, мінеральных угнаенняў і раду іншых матэрыялаў у прамых і водна-чыгуначных зносінах. Адсюль грузы пойдуць у раёны рэспублікі, у Прыбалтыку і паўночна-заходнія вобласці краіны.

Новы порт, які пачаў ужо прымаць судны, поўнасцю будзе ўведзен ў эксплуатацыю ў будучым годзе. Агульная даўжыня лініі прычалаў складзе больш як 700 пагонных метраў. Прадугледжваецца комплексная механізацыя і аўтаматызацыя пагрузачных аперацый.

Яўгеній ЕЎТУШЭНКА

РАЗМОВА З «МАЗАМ»

Як голас краю, роднага і блізкага,
Дзе б ні былі мы, блізкага для нас,
Ля хваль шумлівых мора Карыбскага,
Цудоўны «МАЗ», я твой пачуў тут бас.
Ты на гару ішоў, рудой нагружаны,
Магутны твой матор гудзеў напружана.
І пальмы ўздоўж дарогі да цябе
Ішлі, як нашы сосны у тайзе,
І скалы йшлі чырвоныя, адвесныя,
І сілуэт далёкі карабля,
І хлопец з барадой сьера-маэстраўскай
Кранаўся успацелага руля.
Ты параўняўся і знячэўку дымам
Мяне густым ахутаў на бягу.
Здароў, зямляк! Шкада, што у абдымках
Цябе, як сябра, сціснуць не магу!
Сказаў мне «МАЗ»: — Я доўга плыў сюды,
Я спаў над шэрай безданню вады,
І падалі вячэрняю парой
Дзесяткі рыб зналёту ў кузаў мой.
Начамі ціха, светла так было
І мірна, нібы на другой планеце,
І зоркі, ногі звесіўшы, як дзеці,
Спачыць сядалі на маё крыло.
Мяне ўбачыўшы, вітаў там-тамамі
Загублены між мора астравок.
Кіты салютавалі мне фантанамі:
— На Кубу едзеш? Ты герой, браток!
І фотааб'ектывамі гарматаў
Кружыў амерыканскі чорны ас:
Хацеў праверыць — танк я ці снарады,
Ды памыліўся і на гэты раз.
О, музыкі трапічнай гукі-ліўні,
Мне не забыць ніколі светлы час,
Калі мяне вітала Куба лібрэ,
Гаванскі перапоўнены прычал!
— Салдатам рэвалюцыі ты будзеш, —
Сказаў Фідэль.— І сапраўды: цяпер
Сярод вясёлых маладых барбудас
Барбудасам і я адчуў сябе. —
Так, тут сапраўдныя мужчыны,
А то б і я завёў бы бараду...
І «МАЗ» дадаў чамусьці ў цішы:
— Парою сум бывае на душы.
Я столькі слоў ласкавых берагу.
Як цяжка, што пісаць я не магу!
Я пісьмы б пасылаў машынам гонкім,
Якіх вітаюць ля дарог рамонкі;
Маім вялізным дарагім браточкам,
Што недзе ў стэпах ходзяць днём і ночкай.
І рушыў зноў ён па гарах кубінскіх
Не грузавік, а чарадзейны маг
З барбудасам адчайным у кабіне,
Мой субяседнік і зямляк мой «МАЗ».
Сюды, на востраў вогненны, прышоў ён
Не дзеля славы і не на парад.
Ён быў цудоўны — з рускаю душою
Кубінскай рэвалюцыі салдат.

Пераклад Ул. НЯДЗВЕДСКАГА.

РАДЫЁ

ДЛЯ ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ

Слухайце штодзённа нашы радыёперадачы па сярэднееўрапейскаму часу: на сярэдняй хвалі 227 метраў (ці 1 322 кілагерцы) з 6 да 7 гадзін, з 16.00 да 17.00 і з 21.00. да 21.30;

на кароткай хвалі 30,83 метра (ці 9730 кілагерцаў) з 6 да 7 гадзін.

Па нядзелях: на хвалях 30,83 метра і 227 метраў з 6 да 9 гадзін і з 10 да 13 гадзін;

на сярэдняй хвалі 227 метраў з 16.00 да 17.00 і з 21.00 да 21.30.

НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Па нядзелях — ад 8 гадзін да 8 гадзін 30 мінут па сярэднееўрапейскаму часу на хвалі 30,83 метра (ці 9730 кілагерцаў) і на сярэдняй хвалі 227 метраў.

ДЛЯ ЗША І КАНАДЫ

Слухайце штодзённа нашы радыёперадачы па нью-йоркскаму часу з 19.30 да 20.30 на хвалях: 19,85 метра (ці 15 110 кілагерцаў), 25,08 метра (ці 11.960 кілагерцаў), 25,36 метра (ці 11.735 кілагерцаў).

НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Па суботах — ад 20 гадзін да 20 гадзін 30 мінут па нью-йоркскаму часу на кароткіх хвалях 19,85 метра (ці 15 110 кілагерцаў), 25,08 метра (ці 11 960 кілагерцаў), 25,36 метра (ці 11 735 кілагерцаў).

НАШ АДРАС

Мінск, праспект імя Сталіна, 77. Дом друку, пакой № 20. Для пісьмаў (für Briefe): Minsk, Postschliessfach № 14.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.